ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №4 (129)
САКАВІК 2021 ГОДА

ПРАТЭСТЫ

ЗАТРЫМАЛІ І ПРЫСУДЗІЛІ

Суд над затрыманай на Дзень волі ў Віцебску Крысцінай Юдзінай прайшоў на тэрыторыі ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ). Ёй прысудзілі 25 сутак арышту. Ці адбыліся суды над іншымі віцяблянамі, якіх затрымалі 25 сакавіка, у тым ліку над кіраўніком абласной філіі БНФ Кастусём Смолікавым, пакуль невядома. З пэўнасцю можна сказаць толькі тое, што яны не на волі.

25 сакавіка ў Віцебску быў затрыманы кіраўнік абласной арганізацыі БНФ Кастусь Смолікаў, разам з ім – віцябляне Алесь Вендт і Іван Казлоў. Затрымалі таксама 18-гадовага Руслана Яневіча і 21-гадовую Крысціну Юдзіну. У той жа дзень усіх кінулі ў ІЧУ. Прозвішчы іншых затрыманых высвятляюцца.

Інфармацыі пра тое, за што былі затрыманыя грамадзяне і ў чым іх абвінавачваюць, здабыць не ўдалося.

26 сакавіка, віцебскія журналісты спрабавалі даведацца, калі і дзе адбудуцца суды над затрыманымі, але ні ў водны раённы суд справы віцяблян не паступалі.

Толькі пасля абеду стала вядома пра вынік суду над Крысцінай Юдзінай, які прайшоў у будынку віцебскага СІЗА-2. Як стала вядома, суддзя Вераніка Барысава (суд Першамайскага раёну) на выязным паседжанні пакарала Юдзіну адміністрацыйным арыштам на 25 сутак. Меркавана – за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт. 24.23 КаАП).

Ці прайшлі суды над іншымі затрыманымі – немаведама.

Зміцер Міраш

Чытайце сайт Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

СТАТИСТИКА ПРОТЕСТОВ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

На сайте Витебского облисполкома в разделе «Вопрос-ответ» под рубрикой «Иные вопросы» размещен документ, который касается уличных акций протеста в регионе в августе прошлого года. В нем приведены ответы на обращения демонстрантов в адрес местной власти.

«О фальсификации результатов выборов»

Именно так озаглавлен первый раздел документа.

В нем сообщается, что обращения граждан со сведениями о допущенных, по их мнению, нарушениях бывшим главой администрации Октябрьского района Витебска Сергеем Сташевским законодательства при подготовке итогового протокола голосования на избирательном участке № 25 направлены для рассмотрения в УВД.

В октябре облисполком ответил на письменный запрос TUT.BY: проверка УВД не установила нарушений в работе избирательного участка № 25.

Сташевский не понес никакой ответственности, но лишился своего кресла. В декабре журналистам стало известно, что он работает в Минске — в «Белгидромете».

УСК проводило проверки фактов применения силы сотрудниками МВД

Управление Следственного комитета по области проводило проверки по 13 фактам применения грубой физической силы сотрудниками милиции в отношении 13 участников протестных акций.

Ход проверок находился на контроле в прокуратуре области, по их результатам должны были дать правовую оценку действиям сотрудников МВД.

Однако официальных сообщений о результатах этих проверок УСК и областная прокуратура не опубликовали.

В Витебске задержали столько, что люди не помещались в ИВС

ИВС УВД облисполкома был переполнен — из-за «поступления значительного количества административно задержанных и административно арестованных лиц». Тогда протестующих начали помещать в СИЗО № 2.

Решение «об открытии участка ИВС при УВД Витебского облисполкома на территории следственного изолятора» было принято 10 августа. Там несли службу сотрудники ИВС и действовал его распорядок дня.

57 человек обратились за медпомощью

С 9 по 18 августа 57 участников протестов из разных городов области обратились за помощью в медучреждения в связи с травмами, которые, с их слов, были связаны с массовыми акциями.

(працяг на стар. 2)

ПЕРАСЛЕД

СПРАВА ЖУРНАЛІСТА КАЗАКЕВІЧА

Суд Першамайскага раёну Віцебску 17 сакавіка разгледзеў дзве адміністрацыйныя справы ў дачыненні да журналіста-фрылансера Змітра Казакевіча. Суддзі Андрэй Шыдлоўскі і Вераніка Барысава прызналі яго вінаватым у незаконным вырабе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі (ч.3 арт. 23.5 КаАП) і аштрафавалі агулам на 60 базавых велічынь (усяго 1740 рублёў).

Супрацоўнікі Першамайскага РАУС склалі на журналіста два пратаколы – за два артыкулы, апублікаваныя ў лютым на сайце belsat.eu. На пачатку першага судовага паседжання Зміцер Казакевіч хадайнічаў, каб справы аб'ядналі ў адну, бо яны аднолькавыя па сутнасці. Але суддзя Андрэй Шыдлоўскі хадайніцтва не задаволіў.

Паводле першага пратаколу, 2 лютага Казакевіч, выконваючы функцыі журналіста замежнага СМІ без акрэдытацыі ў МЗС, «злоўжываючы правамі і з парушэннем абавязкаў журналіста», незаконна стварыў матэрыял пад назвай «Выкладчыка віцебскага ўніверсітэту звольнілі за бел-чырвона-белыя фіранкі на акне», які быў размешчаны на сайце Белсату.

Журналіст сваёй віны не прызнаў, сцвярдзіўшы, што адміністрацыйны пераслед у дачыненні да яго вядзецца выключна з палітычных прычын.

Падчас судовага паседжання журналіст цытаваў вытрымкі з раману Джорджа Оруэла «1984»: «Свабода – гэта свабода казаць, што двойчы два ёсць чатыры. Як толькі гэта будзе гарантавана, усё астатняе прыйдзе само сабой».

«Абвінавачваюць мяне толькі таму, што цягам многіх гадоў я спрабую казаць, што двойчы два – чатыры, а не пяць і не шэсць», – сказаў на судзе Казакевіч.

Якія-небудзь тлумачэнні па сваёй справе даваць адмовіўся.

«Бо сорамна мне нешта зараз тлумачыць і бараніцца, калі за кратамі знаходзяцца больш за 10 маіх калег, у тым ліку журналісткі Белсату Дар'я Чульцова і Кацярына Андрэева», – заявіў журналіст.

Нагадаў таксама, што ў Беларусі на сёння 291 палітзняволены.

Суддзя Шыдлоўскі пастанавіў прызнаць Змітра Казакевіча вінаватым і аштрафаваць яго на 30 базавых велічынь. Гэта максімальны штраф, прадугледжаны арт. 23.5 КаАП. Столькі ж, але за іншы артыкул на сайце, прысудзіла журналісту і суддзя Вераніка Барысава.

Зміцер Казакевіч збіраецца абскардзіць судовыя рашэнні.

Уладзімір Бяляўскі
"Віцебская вясна"

СВАБОДА

АЛЕСЬ ЮРКОЙЦЬ ВЫЙШАЎ З «ВІЦЬБЫ»

24 сакавіка пасьля 6-гадовага зьняволеньня выйшаў на волю з калоніі «Віцьба» Віцебскага раёну вядомы беларускі асьветнік з Астравеччыны Алесь Юркойць.

Яму і судоваму працэсу ашмянскіх мытнікаў прысьвечаная кніга Сяргея Дубаўца «Тантамарэскі», якая выйшла ў «Бібліятэцы Свабоды» і летась стала пераможцай літаратурнай прэміі Ежы Гедройця.

«Хтосьці прачытае гэтую кнігу як гісторыю сучаснай Беларусі, хтосьці — як даведнік у судаводзтве, хтосьці — як дэтэктыўны раман з многімі літаратурнымі алюзіямі. Маштабны „Кветкавы працэс" разглядаецца ўсебакова і ў драбніцах, нібы пад мікраскопам. Высновы прыводзяць аўтара да філязофскіх адкрыцьцяў», — гаворыцца ў прадмове выданьня.

Вясной 2015 году былі затрыманыя больш за паўсотні супрацоўнікаў пункта пропуску «Каменны Лог». Супраць мытнікаў завялі пяць крымінальных спраў за спрыяньне ў «кантрабандзе кветак».

У верасьні 2017-га Алеся Юркойца асудзілі на 7 гадоў у так званай «кветкавай справе». Ён належаў да групы з чатырох мытнікаў, якія не прызналі віны і даказвалі, што яны ня бралі хабараў.

Алесь Юркойць вядомы як грамадзкі і культурны дзяяч, адзін з рухавікоў беларускага нацыянальнага жыцьця ў рэгіёне. Праводзіў пленэры, курсы «Мова нанова», стварыў таварыства «Вільнэр» — адзіную на Астравеччыне краязнаўчую суполку, якая вывучала і пашырала веды пра свой край.

На перакана1ньне ягоных паплечнікаў і аднадумцаў, ён апынуўся за кратамі паводле прынцыпу «калектыўнай адказнасьці».

Алесь Юркойць зь вёскі Варняны Астравецкага раёну, з жонкай Ганнай гадавалі трох дзетак. Амаль 20 гадоў адпрацаваў інспэктарам на Ашмянскай мытні.

Усталяваў памятныя камяні і шыльды паэтам Казімеру Сваяку ў Вільні і Янку Быліну ў Клюшчанах; адкрыў музэй братоў Стаповічаў у вёсцы Барані; арганізаваў міжнародныя пленэры жывапісцаў і скульптараў, паэтычны слэм; правёў процьму лекцый, кніжных прэзэнтацый, вандровак і экскурсій; паставіў помнік у вёсцы Слабодка да юбілею паўстаньня Кастуся Каліноўскага; адшукаў 20-ы пункт Дугі Струвэ; арганізаваў «Касінэрскі фэст».

"Радыё Сабода"

ПРАТЭСТЫ

(пачатак на стар. 1)

8 человек из 57 госпитализировали.

Сожаление руководства УВД

В документе говорится, что меры общественной безопасности в области с 9 августа усилили «в связи с имевшейся оперативной информацией о совершении провокаций среди мирного населения».

Руководство УВД облисполкома выражало сожаление, что «среди задержанных в местах проведения несанкционированных мероприятий оказались случайные люди». Облисполком обещал: «по каждому факту превышения полномочий будут проведены проверки».

Обещали «Свободный микрофон» на областном ТВ и свободу собраний

В августе в облисполком поступило предложение о создании на областном телевидении «Свободного микрофона» и передачи с участием представителей гражданского общества.

Чиновники пообещали создать передачу с участием представителей гражданского общества при формировании пакета телепередач на 2021 год. Насколько известно, «Свободный микрофон» на телеканале «Витебск» не появился.

Власти также обещали «предоставить право на свободу собраний граждан в Витебске».

«Жители города Витебска имеют право на свободу собраний в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 30 декабря 1997 г. № 114-З «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь», — отмечается в документе.

Никто не жаловался, что милиция не сообщала родственникам по телефону, где находятся задержанные

Облисполком отмечает, что никто из задержанных не жаловался на то, что их родственникам не сообщили о том, что они находятся в ИВС или РОВД, в течение 3 часов, как того требует закон.

«До утра 18 августа в УВД Витебского облисполкома действовала горячая линия по вопросам представления сведений об административно задержанных и административно арестованных лицах. Информация о таких гражданах предоставлялась при условии сообщения обратившимся гражданином личных данных задержанного или арестованного (фамилии, имени и отчества, даты рождения, места жительства)», — говорится в документе.

В дежурной части ИВС было трудно получить информацию из-за постоянной занятости телефона «ввиду значительного числа поступавших звонков». Однако горожане получали сведения о нахождении в изоляторе родственника, если приходили на КПП, поясняется в документе.

HHB/TUT.BY

КРЫМІНАЛ

СО СКОРОСТЬЮ 165 КИЛОМЕТРОВ В ЧАС

С 2,48 промилле алкоголя в крови на скорости 165 км/ч летел в тот день 29-летний водитель «BMW 525» по трассе М3.

ДТП произошло вечером 11 августа, около 19:00 молодой человек не справился с управлением и серебристый «бумер» после заноса вылетел в кювет, где перевернулся.

Ехавшие в легковушке 28-летний и 46-летний пассажиры во время аварии получили тяжелые травмы, они умерли на месте дорожно-транспортного происшествия. Оба погибших не были пристегнуты ремнями безопасности.

Проведенные позже медицинское освидетельствование и экспертизы установили, что в крови водителя на момент аварии было 2,48 промилле алкоголя, а его автомобиль мчался со скоростью 165 километров в час.

В результате молодому человеку предъявили обвинение по части 5 статьи 317 УК — нарушение правил дорожного движения лицом в состоянии алкогольного опьянения, повлекшее по неосторожности смерть двух лиц — и взяли его под стражу.

Сейчас расследование этого уголовного дела уже завершено, а его материалы направлены в прокурору для изучения и передачи в суд, сообщает официальный представитель УСК по Витебской области Оксана Лазько.

ДАПЛАТА

ПОМОГУТ ЛИ ДЕНЬГИ УДЕРЖАТЬ МОЛОДЕЖЬ?

Недавно руководство Витебской области объявило, что необходимо повысить престижность работы в животноводческой отрасли региона и привлечь туда молодые кадры.

Для этого молодым специалистам решено ежемесячно в течение трех лет доплачивать к заработной плате 1 тысячу белорусских рублей.

Помогут ли эти деньги удержать молодежь на селе и легко ли это отработать в колхозе после колледжа или академии распределение, рассказала Ольга (имя девушки по ее просьбе изменено), которая несколько лет назад закончила аграрный колледж УО «ВГАВМ».

Отрабатывать нам нужно было на государственных предприятиях, потому остаться в городе после получения диплома практически невозможно. Все зоомагазины – частные, ветеринарные клиники без опыта работы не берут, а чтобы попасть по распределению на молочное или мясное предприятие, нужен немаленький блат. Потому, если посмотреть правде в глаза, то нужно признать: абсолютному большинству выпускников предстоит отработать распределение в колхозе на районе.

Ольгу отправили в Витебский район. Молодой специалист должна была работать в ветфельдшером, но по прибытию на место ей сказали написать заявление на должность ветврача. А уже через неделю девушке объявили, что она – главный ветеринарный врач, потому как другого просто нет.

Конечно, это очень тяжело. Ты – городская девочка, всю жизнь жила с мамой, а тут приезжаешь в деревню, где тебе приходится буквально выживать. Я была к этому не готова.

Условий нет, зарплата фактически минимальная и часто даже обычных медикаментов не хватает. Да и отношение к молодому специалисту оставляет желать лучшего. Работники колхоза ведут себя так, будто они все знают, а ты – ничто, рабсила, на которой пахать можно.

Когда Оля приехала на работу, то ей сразу предложили общежитие. Девушка сначала обрадовалась, но когда зашла в комнату, то просто обомлела. Кроме стен там не было ничего, ни одного предмета мебели. Взять все необходимое молодому специалисту было негде, потому она стала искать, у кого можно снять комнату. Договорилась с местной жительницей. Все было неплохо, разве что горячая вода отсутствовала.

Кроме этого, ветврачу объявили, что по договору у нее как бы есть один выходной, но так как работать некому, то на работу нужно выходить ежедневно.

Общее поголовье коров тогда в колхозе было порядка 2,5 тысяч. Я должна была следить за порядком на комплексе, двух фермах и в поле, где в летнее время располагались точки с коровами. Кроме этого, я отвечала за ветеринарную аптеку, должна была заказывать, забирать и привозить лекарства, составлять отчеты, отвозить их и даже мерить температуру в силосной яме. А если какая-нибудь телятница уйдет в запой, то телят тоже нужно мне выкармливать, иначе подохнут, а вычтут снова с меня.

По словам Ольги, работать было очень сложно, ведь чтобы сделать укол той же корове, нужно ее хотя бы минимально зафиксировать. А как это сделать одной хрупкой девушке, вес которой менее 50 кг? В результате Оля зарабатывала синяки, ссадины и раны от крупного рогатого скота.

А еще есть местные доярки, телятницы и другие рабочие женского пола, которые ревнуют тебя к местным мужчинам, уделяющим внимание городской девочке. Так и мне однажды шофер, который возил меня по всем объектам, сказал, что просили передать, что если я буду так одеваться, то меня утопят в говне.

Оля отработала по распределению год и уехала, поступив в ветеринарную академию. По словам девушки, бежала дальше, чем видела, потому как держаться там было просто не за что. Зарплата главного ветеринарного врача четыре года назад составляла 377 рублей в месяц.

У Оли и сегодня немало знакомых, кто работает в сельском хозяйстве. По словам девушки, зарплаты с того времени не особо поменялись. В лучшем случае специалист может рассчитывать максимум на 500 рублей заработной платы. При этом жильем обеспечивают далеко не всех, некоторым приходится за свой счет снимать жилье.

Я разговаривала со своими знакомыми на предмет того, что они скоро станут богатыми, ведь им будут доплачивать целую тысячу. В ответ они мне рассмеялись. Как это может быть, если в колхозах часто грешат и не выплачивают вовремя зарплату. Например, мне как-то задержали на три месяца, даже продуктов никто не предложил, живи – как хочешь. Такие ситуации случаются и сегодня, потому какая тысяча?

По словам Ольги, со стороны руководства колхозов очень мало делается для того, чтобы поддержать молодого специалиста. Если в хозяйстве нет другого ветчрача, то и подсказать некому, как и что делать. К примеру, во время работы молодого специалиста в колхозе случился падеж телят. С Ольгой связалась районная ветстанция, спросила, сколько телят умерло за последнее время. Молодой специалист честно ответила, что шесть.

Буквально через десять минут мне позвонили с управления колхоза и накричали, что я не имела права так говорить, ведь в месяц могут сдохнуть только двое телят. А откуда я должна была это знать? А как райветстанция присылала мне отчеты вскрытия умерших телят, хотя я даже не посылала им биологический материал? Или как мне говорили писать, что измеряемая температура в норме, хотя это было не так? Цирк да и только.

Если вам нужно, чтобы на бумаге было все отлично, так скажите мне об этом, и я не буду тратить свое время, силы и нервы и куда-то выезжать, а буду сразу писать то, что нужно.

Я поняла одно: сельская жизнь – не для меня. Местные жительницы с восторгом рассказывали, как они единственный раз в жизни побывали в Минске, – и это предел их мечтаний.. Нет уж, увольте, это не мое.

А как вы считаете, легко ли работать нынче в сельском хозяйстве?

Марина Леонова
vkurier.info

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэлефануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

КАНСТЫТУЦЫЯ

ШМАТКРОЦЬ ПЕРАПІСАНАЯ І НЕ ДЗЕЮЧАЯ

Дваццаць сем гадоў таму, 15 сакавіка 1994 года, быў прыняты Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Але за гэтыя гады Канстытуцыя так і не стала галоўным дзеючым законам краіны. Яе тройчы «перапісвалі» на рэферэндумах, але ні адзін з іх не быў легітымным.



Рэферэндум-1995

З ініцыятывай правядзення рэферэндуму выступіў Лукашэнка. Ён прапанаваў на ўсенароднае абмеркаванне чатыры пытанні: «Ці згодныя вы з наданнем рускай мове роўнага статусу з беларускай?»; «Ці падтрымліваеце вы прапанову аб усталяванні новых дзяржаўнага сцяга і дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь?»; «Ці падтрымліваеце вы дзеянні прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, скіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй?»; «Ці згодныя вы з неабходнасцю ўнясення змен у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі?».

Ужо ад пачатку фармулёўкі пытанняў былі незаконнымі. Яны супярэчылі Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі (прэамбуле і артыкулам 1, 2 і 3), Канстытуцыі (прэамбуле, артыкулам 17 і 78), Закону «Аб усенародным галасаванні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь» (артыкул 3). Першае і другое пытанні груба парушалі «неад'емнае права беларускага народа на суверэнную нацыянальную дзяржаўнасць, гарантыі існавання беларускай культуры і мовы». Нельга было выносіць на рэферэндум пытанні наконт мовы і нацыянальных дзяржаўных сімвалаў.

Пытанне аб адабрэнні прарасійскай палітыкі супярэчыць суверэннай нацыянальнай дзяржаўнасці. Акрамя таго, яно парушае міжнародныя абавязальніцтвы Рэспублікі Беларусь.

Фармулёўка чацвёртага пытання аб прадастаўленні прэзідэнту права спыніць паўнамоцтвы парламента «ў выпадках сістэматычнага або грубага парушэння ім Канстытуцыі» ідзе ў разрэз з нормай Дэкларацыі аб суверэнітэце, згодна з якой толькі Вярхоўны Савет мае права выступаць ад імя беларускага народа, а таксама з шэрагам палажэнняў Канстытуцыі.

Гэты рэферэндум быў прызначаны і з парушэннем працэдуры. 11 красавіка 1995 года Вярхоўны Савет 12-га склікання прыступіў да разгляду прапановы Лукашэнкі, супраць якой выступілі дэпутаты ад БНФ. У выніку ВС не падтрымаў ініцыятыву кіраўніка дзяржавы. Лукашэнка заявіў, што прыпыніць дзейнасць парламента і ўсё адно правядзе рэферэндум. У знак пратэсту дэпутаты ад БНФ абвясцілі галадоўку ў зале пасяджэнняў парламента. Уначы з 11 на 12 красавіка ў парламент уварваліся людзі ў масках, збілі і выкінулі адтуль парламентароў.

13 красавіка 1995 года ВС шляхам паўторнага галасавання прыняў пастанову аб прызначэнні рэферэндуму. Аднак паўторнае галасаванне па працэдуры не дапускалася.

Больш за тое, згодна з Канстытуцыяй, забаранялася ўносіць змены і дапаўненні ў Канстытуцыю (пытанне № 4) у апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў парламента. У той перыяд рэферэндум наогул не мог быць прызначаны!

Такім чынам, рэферэндум 1995 года быў незаконным. Усе дзеянні, скіраваныя на рэалізацыю пастаўленых на рэферэндуме пытанняў, варта прызнаць злоўжываннем уладай і гвалтам у дачыненні да беларускага народа.

Рэферэндум-1996

Праз дэпутацкае лобі ў Вярхоўным Савеце 13-га склікання Лукашэнка дамогся прыняцця рашэння аб прызначэнні рэферэндуму. Лукашэнка прапанаваў: перанесці Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня — Дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў; прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са зменамі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі), прапанаванымі Лукашэнкам. А таксама адказаць на пытанні: «Ці выступаеце вы за свабодныя, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі?», «Ці падтрымліваеце вы адмену смяротнага пакарання?».

Былі яшчэ і пытанні ад парламента, але на іх мы спыняцца не будзем.

Пытанне аб пераносе Дня незалежнасці на 3 ліпеня было ўвогуле недарэчным, бо супярэчыла рэчаіснасці. Вядома, што Дэкларацыя аб суверэнітэце Беларусі была прынятая 27 ліпеня, і падвяргаць сумневу гэты факт проста нельга.

Безумоўна, галоўным было пытанне аб прыняцці Канстытуцыі Беларусі «са зменамі і дапаўненнямі (новай рэдакцыі Канстытуцыі)». Для большасці суддзяў КС было зразумела, што Лукашэнка прапануе на рэферэндум новую Канстытуцыю — і тым самым адмяняе дзеючую Канстытуцыю. Аднак з-за супрацьстаяння ў складзе суда прыняць прынцыповае рашэнне па гэтым пытанні не ўдалося. У выніку КС прызнаў, што «папраўкі» не могуць выносіцца на абавязковы рэферэндум і, адпаведна, не могуць быць уключаны ў тэкст Канстытуцыі пасля іх прыняцця.

Больш за тое, пытанне пра Канстытуцыю не магло быць вынесена на рэферэндум, паколькі на яго нельга было даць адназначны адказ. Цяжка нават зразумець, за што прапанавалася галасаваць: за змены і дапаўненні ў Канстытуцыю, за новую рэдакцыю Канстытуцыі або за новую Канстытуцыю?

Пытанне аб куплі і продажы зямлі было сфармулявана правакацыйна, бо адказ на яго чаканы. Продаж зямлі «без абмежаванняў» супярэчыць інтарэсам народа, які з'яўляецца ўласнікам усіх рэсурсаў і багаццяў на сваёй тэрыторыі.

І нават пытанне аб адмене смяротнага пакарання было складаным для разумення. Што такое адмена? Мараторый, невыкананне пакарання, пажыццёвае зняволенне? У сувязі з гэтым яно таксама не магло выносіцца на рэферэндум.

На падставе рашэння Канстытуцыйнага суда ад 4 лістапада дэпутаты парламента зрабілі галасаванне пра Канстытуцыю «рэкамендацыйным». Лукашэнка не пагадзіўся з рашэннем КС і «адмяніў» яго (указам ад 7 лістапада 1996 года № 459). Ён запатрабаваў ад органаў улады, у тым ліку Цэнтрвыбаркама, праводзіць абавязковы рэферэндум па пытанні пра змены ў Канстытуцыю.

Старшыня Цэнтрвыбаркама Віктар Ганчар на прэс-канферэнцыі 14 лістапада 1996 года выказаў свой пратэст — і быў вызвалены ад пасады прэзідэнцкім указам. На яго месца Лукашэнка прызначыў Лідзію Ярмошыну. Будынак Цэнтрвыбаркама быў заблакаваны людзьмі ў «форме», якія не прапускалі ў яго нікога да падвядзення вынікаў рэферэндуму.

З 27 лістапада 1996 года «новая рэдакцыя Канстытуцыі» была ўведзена ў дзеянне. Легітымныя органы ўлады (Вярхоўны Савет, Кантрольная палата, Канстытуцыйны суд) былі незаконна распушчаныя.

Спецкамісія Вярхоўнага Савета на чале з Ганчаром кваліфікавала гэта як захоп дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам.

Рэферэндум-2004

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года стала пытанне падаўжэння тэрміну паўнамоцтваў Лукашэнкі. Асноўнай перашкодай з'яўлялася палажэнне артыкула 81 Канстытуцыі, згодна з якім адна і тая ж асоба не магла быць прэзідэнтам больш за два тэрміны. Трэба было зноў мяняць Канстытуцыю.

Чарговы рэферэндум быў абвешчаны ўказам кіраўніка Беларусі ад 7 верасня 2004 года № 431 (раней прызначэнне плебісцыту было выключна прэрагатывай парламента). На абмеркаванне выносілася адно, але вельмі аб'ёмнае пытанне: «Ці дазваляеце вы першаму прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнка А. Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах прэзідэнта і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі:„Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры таемным галасаванні"?»?

Указ уступіў у сілу на наступны дзень пасля яго выдання, калі ўжо ішла кампанія па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Рэферэндум пайшоў «у дадатак» да выбараў, якія адбыліся 17 кастрычніка.

Але такі парадак прызначэння рэферэндуму не адпавядае артыкулу 74 нават «новай Канстытуцыі». Згодна з часткай 3 гэтага артыкула, дата правядзення рэферэндуму прызначаецца не пазней

(працяг на стар. 4)

ПРАЎДА ЖЫЦЦЯ

«МОЛЧАНИЕМ ПРОДАЕТСЯ БОГ»

Архиепископ Гродненский и Волковысский Артемий в Прощеное воскресенье высказался о ситуации в Беларуси: «Быть христианином — это значит быть крестоносцем. Начиная в борьбе со своими пороками, в борьбе со своим личным грехом, в борьбе с общественными настроениями, с церковными проблемами — это крест тяжелый, который надо нести, иногда жертвуя собой.»

— Сейчас, конечно, времена очень сложные. Господствуют пороки, господствует зло. Это все разъединяет людей. И общественное разъединение, как мы все знаем, происходит. Причина в том, что царство мира сего желает видеть в церкви только идеологически-политический аппарат, подвластный ее механизму, — сказал священнослужитель.

Архиепископ отметил, что церковь прежде всего «Царство Божие на земле».

— Идти путем приспособленчества — это путь самоуничтожения. Входить в политику, входить в какие-то другие проблемы, тоже не присуще церкви. Но церковь не должна быть безразлична ко всему происходящему. Новомученики и праведники нашего времени всегда говорили: «Молчанием продается Бог». Быть христианином — это значит быть крестоносцем. Начиная в борьбе со своими пороками, в борьбе со своим личным грехом, в борьбе с общественными настроениями, с церковными проблемами — это крест тяжелый, который надо нести, иногда жертвуя собой.

Архиепископ Артемий — один из немногих иерархов Белорусской православной церкви, который открыто высказывает свое мнение о происходящем в Беларуси. Во время августовских событий он резко осуждал насилие как в официальных воззваниях, так и с церковного амвона.

В конце ноября прошлого года БПЦ получила предупреждение от уполномоченного по делам религии и национальностей. С чем конкретно было связано предупреждение, не разглашается, но митрополит Вениамин в письме архиепископу Гродненскому и Волковысскому Артемию попросил его обеспечить во вверенной ему епархии соблюдение белорусского законодательства, а также «решений и позиции Синода Белорусской православной церкви».

Ранее Александр Лукашенко потребовал от представителей различных конфессий не вмешиваться в вопросы политики: «Дорогие мои священнослужители, остепенитесь и займитесь своим делом. [...] Вам будет стыдно и позорно за то, какую вы, некоторые, позицию занимаете сейчас. И государство с безразличием на это смотреть не будет».

Тут.бай

КАНСТЫТУЦЫЯ

(пачатак на стар. №3)

чым за тры месяцы з дня выдання ўказа прэзідэнта аб прызначэнні рэферэндуму.

Калі прытрымлівацца літары Канстытуцыі, то бачна, што на рэферэндум могуць выносіцца «важнейшыя пытанні» дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Між тым, пастаўленае пытанне адлюстроўвае праблему аднаго грамадзяніна — Аляксандра Лукашэнкі, які да гэтага двойчы прыносіў прысягу на вернасць Канстытуцыі.

На рэферэндум ставілася пытанне, непасрэдна звязанае з удзелам у прэзідэнцкіх выбарах і наступным выбраннем на пасаду Лукашэнкі. Між тым, у адпаведнасці з часткай 2 артыкула 112 Выбарчага кодэкса, «на рэспубліканскі рэферэндум не могуць выносіцца пытанні... звязаныя з абраннем і вызваленнем ад пасады прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Уключэнне ў бюлетэнь для галасавання пытання, у фармулёўцы якога захоўваюцца, па сутнасці, два розныя паводле зместу і сэнсу пытанні (пра дазвол Лукашэнку балатавацца і пра «папраўку» ў Канстытуцыю), таксама забараняецца Выбарчым кодэксам. Згодна з ім, «пытанне, якое выносіцца на рэспубліканскі рэферэндум, павінна быць сфармулявана... выразна і ясна з тым, каб на яго быў магчымы адназначны адказ».

Нягледзячы на парушэнне парадку прызначэння рэферэндуму, недапушчальнасць пытання, пастаўленага на галасаванне, грубыя парушэнні заканадаўства пры галасаванні, рэферэндум быў прызнаны адбыўшымся. Па яго выніках былі ўнесены змены ў артыкул 81 «новай Канстытуцыі», і ў 2006 годзе Лукашэнка зноў балатаваўся кандыдатам у прэзідэнты.

Рэзюмэ

Як бачым, усе рэферэндумы насілі неканстытуцыйны, незаконны і недэмакратычны характар. З юрыдычнага пункту гледжання іх вынікі не маюць значэння. Гэта значыць, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года захоўвае свой легітымны характар. Яе трэба ачысціць ад так званых «паправак» і аднавіць дзеянне. А пасля ўжо абмяркоўваць нейкія змены.

Міхаіл Пастухоў, Сяргей Пульша
novychas.by

НАША ЖЫЦЦЁ

АДТОК МЕДЫКАЎ ПАБІЎ РАНЕЙШЫЯ ГАДАВЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

У Беларусі публікуюцца дадзеныя ад чыстым прытоку і адтоку рабочых розных сфераў. Параўнаўшы яго, можна ўбачыць, якія галіны ў заняпадзе, а якія растуць. Мы вывучылі графу «Ахова здароўя» як адну з фундаментальных для дзяржавы.

Рэальнасць сумная. Па афіцыйных дадзеных, толькі за студзень 2021 года чысты адток кадраў са сферы аховы здароўя склаў 724 чалавекі.

Калі зазірнуць яшчэ на сайт дзяржаўнай службы занятасці, то станам на 10 сакавіка там 4335 вакансій доктара (+162 з лютага), 1736 вакансій санітараў і 2919 вакансій медыцынскіх сёстраў.

Адсачыўшы дынаміку за апошнія некалькі год, атрымліваецца, што Беларусь губляе медыкаў на чыстай аснове з 2016 года.

Да 2016-га таксама былі гады з чыстым адтокам, але яны дзе-ніздзе кампенсоўваліся гадамі з чыстым прытокам. А вось з 2016-га як прарвала.

Пакрысе, пакрысе, і ў 2019-м краіна страціла ўжо больш за 400 спецыялістаў, у 2020-м каля таго, 2021 ужо пабіў усе рэкорды.

З 2021 годам усё зразумела. Мы ўжо неаднаразова апісвалі маштабы ўцёкаў медыкаў.

Чытайце таксама. Эміграцыя медыкаў з РНПЦ анкалогіі набывае трывожны маштаб: «Зона камфорту знішчана людзьмі ў чорным»

Чытайце таксама. «Інтэрны вядуць найцяжэйшых пацыентаў»: вопытныя дактары разбягаюцца з РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, сачыць за парадкам даслалі спецслужбіста

Але мы паспрабавалі зразумець, чаму 2019 стаў пераломным, калі медыкі пачалі бегчы рэкорднымі тэмпамі.

Пасля размоваў са спецыялістамі вымалёўваюцца такія асноўныя прычыны:

— У 2019 Польшча і Германія спрасцілі працэдуру пацверджання медыцынскіх дыпломаў краін, якія не ўваходзяць у Еўрасаюз.

— Рэкордная колькасць абітурыентаў, якія паступалі ў медыцынскія ВНУ у 2010 годзе, аказаліся «свабоднымі» у 2019-м пасля заканчэння усіх стадый вучобы.

— У 2019 змянілася сістэма налічэння заробкаў, прэмій і уліку працоўнага часу, у выніку чаго многія страцілі ў грошах.

Пра гэта нам сказалі некалькі медыкаў, з якімі мы пагаварылі.

Рэпрэсаваныя выкладчыкі БДМУ дадаюць да прычын масавага сыходу той факт, што заробкі медыкаў выглядаюць мізэрнымі, і многія выпускнікі пачынаюць шукаць лепшай долі адразу, як гэта становіцца магчымым.

Гэта справядлівы аргумент. Варта зірнуць у афіцыйную статыстыку заробкаў — прамысловасць абганяе медыцыну на 20–30%. Пры тым што вельмі часта прамысловасць — такая ж датацыйная сфера, як і медыцына.

Даходзіць да абсурдаў: у ліпені 2020 года дырэктар Беларускага металургічнага завода хваліўся 1400 рублямі сярэдняга заробку на прадпрыемстве. Як потым стала вядома, гэта не зарплата, а цалкам крэдытныя заробкі. У гэты ж час сярэдні заробак медыкаў па краіне быў 1177 рублёў, нават з улікам кавідных выплат.

Што з гэтым усім рабіць, рашуча не зразумела. Няма ніякіх прыкмет, што адток медыкаў спыніцца.

«Нагрузка павялічваецца, статус падае. Многія рэпрэсавалі, многія плюнуць і з'ездуць», — лаканічна кажуць «Нашай Ніве» медыкі і дадаюць, што звальняючы такіх ікон прафесіі, як Мартаў і Мрочак, сістэма падштурхоўвае да ад'езду тых, хто раней адкладаў яго.

Арцём Гарбацэвіч
"Наша Ніва"

МЕДЫЦЫНА

«ПОПЕРЛО ТАКОЕ, ЧТО НИ В СКАЗКЕ СКАЗАТЬ, НИ ПЕРОМ ОПИСАТЬ»

Уволенный заведующий отделением анестезиологии и реанимации БСМП Витебска доктор Владимир Мартов — о том, что последовало за его обращением к руководству Минздрава.

— Для моего поколения наше все — это фильм «17 мгновений весны». Лиознова — это наша Лени Рифеншталь, гениальная, как и должно быть...

«Наши успехи неоспоримы», — читает Штирлиц через плечо Габи текст новой колонки какой-то гитлеровской газетенки. И не поспоришь! Это вечно)) — пишет Владимир Мартов. — Вообще же идти с папочкой с документиком против Гиммлера на прием к самому Гиммлеру — так себе идейка. И все же Штирлиц считал тот день на приеме у Гиммлера самым удачным в его жизни, хотя и был на грани провала.

Так и мое обращение к министру здравоохранения в день ЧП 8.01.2021 — так себе поступок. Приехала комиссия от самого министра, мне дали выговор и в конце концов уволили.

Сейчас выяснилось, что комиссия, направленная 13.01 министром по моему обращению, не была в курсе про проблемы с перебоями в доставке кислорода у меня в БСМП. Они даже не знали, по какому поводу их к нам направили.

А теперь поперло такое, что ни в сказке сказать, ни пером описать. Комиссия за комиссией, выступление в СМИ медицинских начальников разного ранга.

Новая вводная: оказывается, теперь уже кислород не важен...

До этого я много лет слышал, что анализы не лечат. А когда заканчивались лекарства — слышал, что они тоже не лечат.

Теперь вот кислород не лечит.

Все они, вот эти медицинские начальники — они прекрасны!

Сейчас наступает этап словесной эквилибристики: пациенты ведь все равно умирают от коронавирусной инфекции!

Если пациенту не хватило лекарства — он умер от ковида.

Если пациенту не хватило аппарата ИВЛ — он умер от ковида.

И даже если пациенту не хватило кислорода — он все равно умер от ковида.

И не поспоришь! «Наши успехи неоспоримы!»

gazetaby.media

ФІНАНСЫ

ПА $500 НЯМА І БЛІЗКА

45,5% беларусаў жывуць менш як на 193 даляры ў месяц. Гэта лічбы афіцыйнай статыстыкі.

1290 рублёў — такі сярэдні заробак дае афіцыйная статыстыка па Беларусі ў студзені. Гэта намінальны налічаны сярэдні заробак, то бок бяз выплаты ўнёскаў і падаткаў, так званае брута. Па сярэднім курсе за студзень — гэта 503 даляры.

Сярэдні заробак па краіне ўлічвае і самыя вялікія, і самыя нізкія заробкі, у выніку дае сярэднюю велічыню. Але ў рэальнасьці асноўная маса беларусаў жыве на нашмат меншыя грошы.

Толькі 8,7% маюць на месяц 411 даляраў і больш

Белстат апублікаваў статыстыку па сярэднедушавых рэсурсах беларусаў на месяц. Гэта выбарачнае дасьледаваньне хатніх гаспадарак, якое ўключае ў сябе людзей усіх узростаў (тых, хто не працуе — таксама).

Паводле гэтага дасьледаваньня, 45,5% беларусаў маюць на месяц менш, чым 500 рублёў, або 193 даляры. Гэта 4,2 мільёна чалавек.

1,5% беларусаў маюць даход меншы, чым 200 рублёў на месяц, 2,6% — меншы, чым 300 рублёў. І толькі 8,7% маюць даход, большы за 1000 рублёў або 411 даляраў.

Іншае афіцыйнае дасьледаваньне кажа пра сумы, на якія жыве сям'я ў месяц. Паводле яго, у сярэднім адна хатняя гаспадарка (сям'я) мае 1458,9 рубля на месяц. У сям'і можа быць і адзін чалавек, але часьцей больш. Найменшы даход сем'і маюць у сельскай мясцовасьці — 1207,7 рубля на месяц.

Сярэдні расход на месяц на адну гаспадарку — 1391,2 рубля, найбольш з гэтага (73,9%) людзі трацяць на спажывецкія расходы: харчаваньне, вопратка, аплата паслуг.

Для параўнаньня, сярэдні даход сям'і ў Нямеччыне (дасьледаваньне 2018 году, робіцца раз на 5 гадоў) — 3726 эўра на месяц, сярэднія траты — 2704 эўра. На чацьвёртым месцы па тратах, пасьля аплаты жыльля, транспарту і харчаваньня, — забавы і адпачынак.

Доўгі час афіцыйныя ўлады Беларусі ганарыліся сярэднім заробкам 500 даляраў, які намінальна «па сярэдняму» ўсё ж выходзіць паводле афіцыйнай статыстыкі. І ў параўнаньні з такімі краінамі, як Малдова і Ўкраіна, гэта глядзелася няблага.

Напрыклад, у 2018 годзе сярэдні заробак у Беларусі быў 420 даляраў, у Малдове — 245, ва Ўкраіне — 180.

Але цяпер Малдова перагнала Беларусь па сярэднім заробку: 520 даляраў у рэальным сэктары напрыканцы 2020 году (у Беларусі — 503 даляры). Ва Ўкраіне сярэдні заробак набліжаецца да 500 даляраў (444 даляры ў студзені).

"Радыё Свабода"

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5,
Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 30.03.2021 у 18.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.